**СПРАВЫ БІБЛІЯТЭЧНЫЯ**

# «ЛЮБОЎ ДА РОДНАГА КРАЯ ПРАЗ КНІГУ»

## Такую назву атрымала вітрынная фотавыстава, якая адкрылася ў гарадской дзіцячай бібліятэцы-філіяле №8

Адкрыццё фотавыставы было прымеркавана да дэкады беларускай і краязнаўчай кнігі "Мову родную, край свой любіце", якая праходзіла ў бібліятэках нашага горада. Мэта выставы - абудзіць у падрастаючага пакалення любоў да роднай мовы і літаратуры.

У бібліятэчным абслугоўванні самым папулярным і базавым сродкам давядзення інфармацыі да карыстальнікаў з'яўляецца кніжная выстава, якая раскрывае фонды бібліятэкі. Ужо далёка ў мінулым засталіся шэрыя, блёклыя кніжныя выставы. У наш час ёсць шмат магчымасцей паказаць кнігу ў найлепшым выглядзе. Выстава - гэта заўсёды творчасць, дзякуючы якой магчыма аб'яднаць у адно цэлае бібліятэкара, кнігу і карыстальніка.

Сённяшні дзень патрабуе ад бібліятэк мэтанакіраванай работы па папулярызацыі кнігі, здольнай прышчапіць юнаму чытачу павагу да Айчыны, малой радзімы, гісторыі і культуры свайго народа. Роднае слова нездарма называюць люстэркам культуры, яе захавальнікам. Таму вельмі радуе, калі нашы маленькія чытачы выбіраюць кнігі на роднай мове і чытаюць іх з задавальненнем.

Вітрынная фотавыстава "Любоў да роднага края праз кнігу" працягвае сваю працу, таму ўсіх жадаючых наведаць яе альбо прыняць удзел запрашаем у гарадскую дзіцячую бібліятэку-філіял №8.

**Надзея ШУМСКАЯ, загадчык бібліятэкі-філіяла №8.**

**Шумская, Н. «Любо**ў да роднага края праз кнігу» / Надзея Шумская // Жыццё Палесся. – 2016. – 22 марта. – С. 5.